# Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь
# народны вакальна-харэаграфічны ансамбль «Скарбонка»
# філіяла «Гомельскія цеплавыя сеткі»
# Гомельскае РУП «Гомельэнерга»

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны вакальна-харэаграфічны ансамбль «Скарбонка» з'яўляецца пастаянна дзеючым калектывам мастацкай самадзейнасці філіяла «Гомельскія цеплавыя сеткі» Гомельскае РУП электраэнэргетыкі «Гомельэнерга» з 22 снежня 1995 года.

Агульная колькасць калектыву – 57 чалавек, ва ўзросце ад 22 да 60 гадоў, сацыяльны статус якіх – рабочыя і служачыя. Для рэпетыцый калектыву выдзелена актавая зала, абсталявана зала для танцаў. Калектыў мае прыгожае сцэнічнае адзенне, адлюстроўвае нацыянальныя звычаі, характар і густ славянскіх народаў. У рэпертуары калектыву беларускія, рускія, украінскія народныя песні, вакальна-харэаграфічныя кампазіцыі.

Калектыў адрозніваецца прадуманасцю ў выбары музычнага матэрыялу, пошукам уласнага харэаграфічнага почырку, разнастайнасцю рэпертуару, асабістай манерай выканання беларускай народнай песні ў аўтарскіх апрацоўках.

Крыніцай фарміравання рэпертуару з'яўляецца багаты беларускі народны фальклор, а таксама фальклор другіх славянскіх народаў. На працягу многіх гадоў рабіліся апрацоўкі беларускіх, рускіх, украінскіх народных песен, а таксама вакальна-харэаграфічныя кампазіцыі, інструментальныя творы, аўтарскія кампазіцыі. У творчасці самадзейнага калектыву «Скарбонка» спалучаюцца фальклорны нацыянальны пачатак з сучаснай рытмікай.

Для ўдзельнікаў калектыву характэрны добрыя вакальныя навыкі, харэаграфічная падрыхтоўка, выканаўчая і сцэнічная культура, прыродны артыстызм. Гэта стала магчыма таму, што на рэпетыцыях ідзе сур'ёзная падрыхтоўка калектыву. Калектыў вылучае дысцыпліна, арганізаванасць, як у рэпетыцыйнай рабоце, так і ў канцэртнай дзейнасці, якую «Скарбонка» вядзе вельмі актыўна.

Калектыў «Скарбонка» – пастаянны ўдзельнік міжнародных, рэспубліканскіх і абласных фестываляў. За час свайго існавання з 1995

года калектыў з'яўляецца пастаянным удзельнікам аглядаў-конкурсаў мастацкай самадзейнасці Савецкага раёну г. Гомеля, рэспубліканскіх аглядаў-конкурсаў, а так сама мерапрыемствах вобласці і горада.

